Ирландии характерно отсутствует большого разнообразия десертов. Исходя из вышеперечисленного, можно сделать вывод о том, что кухни рассматриваемых стран богаты своими национальными блюдами, традиции, приготовления которых схожи в обеих странах, не смотря на отдалённое географическое положение.

1. LINGUA Airlines: ONLINE ENGLISH SCHOOL [Электронный ресурс]. - Режим доступа: https://lingua-airlines.ru. – Дата доступа : 11.03.2018.

2. Похлёбкин, В.В. Национальные кухни наших народов / В. В. Похлёбкин. - М. : Центрполиграф. - 2004. – 329 с.

3. Сервис по оказанию туристических и образовательных услуг в Лондоне [Электронный ресурс]. - Режим доступа: http://tourism-london.ru. – Дата доступа: 28.02.2018.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Дубінчына Л.С.,** студэнт

Навуковы кіраўнік – Кодзенеў М.А.

## НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ ТРАДЫЦЫІ Ў БЕЛАРУСКАЙ АНІМАЦЫІ

Анімацыйнае кіно (мультыплікацыя), від кінамастацтва, творы якога ствараюцца спосабам пакадравага малявання або іншымі тэхнічнымі спосабамі. У залежнасці ад тэхнікі стварэння сучаснае анімацыйнае кіно падзяляецца на маляванае, аб'ёмнае («лялечнае»), ценявое (заснавана на прынцыпе тэатра ценяў), камп'ютэрнае, камбініраванае і іншае [1, 22].

У анімацыйным фільме, дзеля дасягнення яго мэты (сверхзадачы) выкарыстоўваюцца аўдыяльныя (шум, музыка, маўленне) і візуальныя (кампазіцыя кадра, формы, рухі герояў і іх дзеянні, каларыстыка) сродкі выразнасці. Анімацыя «адушаўле» і мае магчымасць паказаць любую з‘яву, антрапамарфізмы, фантастычныя аб‘ектамі. У анімацыйных творах

прысутнічаюць гэгі, камічнасць, асаблівая фізіка персанажаў, гіперэмацыйнасць і іншыя сродкі выразнасі, дзякуючы якім сюжэт твора ўвасабляецца найбольш яскрава, робіцца запамінальным.
Дзякуючы шырокаму колу сродкаў выразнасці і іх магчымасцяў, анімацыйнае кіно можа цікавейшым чынам садзейнічаць захаванню, развіццю і трансляцыі традыцый. Анімацыйныя творы транслюць нацыянальныя традыцыі праз бачанне аўтара/аўтараў: рэжысёра, аніматараў, кампазітараў, актораў. Па гэтай прычыне ў мастацкіх творах традыцыі могуць быць аздоблены, трансфармаваны ці зменены.

Мы вызначаем традыцыю як сукупнасць звычаяў, абрадаў, норм паводзін, поглядаў, правіл, якія складваюцца гістарычна перадаюцца з пакалення ў пакаленне і адлюстроўваюцца ў элементах сацыяльна-культурнай спадчыны. Традыцыі звычайна служаць асновай нацыянальнай культуры і надаюць ёй цэласнасць і самабытнасць [1, 320]. Элементы сацыяльна-культурнай спадчыны ўключаюць у сабе матэрыяльныя і нематэрыяльныя культурныя каштоўнасці.

Гісторыя беларускага анімацыйнага кіно пачынаецца з 1920-х г., калі былі створаны першыя мультыплікацыйныя навукова-папулярныя фільмы. [1, 22]. Афіцыйным годам нараджэння з‘яўляецца 1973, калі пры кінастудыі «Беларусьфільм» была заснавана мультыплікацыйная майстэрня [3].

Вялікая колькасць рэжысёраў у сваіх творах з‘вяртаецца да традыцый, фальклору, міфалогіі.

Яўген Ларчанка ў карціне «Пакацігарошак» 1990 г. распавядае казку ад імя батлейшчыкаў. Батлейка – беларускі народны лялечны тэатр вядомы з 16 стагоддзя, уяўляе сабой скрыню з двума ці трыма сцэнамі-ярусамі, прадстаўленні на якіх ставяцца на рэлігійныя і побытавыя сюжэты. .

Міхаіл Тумеля выкарыстоўвае стылізацыю выцінанкі у сваіх стужках «Беларускія прымаўкі» 2008, «Як служыўжа я ў пана» 2012 (з зборніка «Музыкальная скарбонка»), «Выцінанка-выразанка» 2010. Выцінанка – від беларускага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, творывыконвыецца з паперы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пры дапамозе нажніц ці нажа. Традыцыйна выцінанку выкарыстоўвалі для упрыгожвання вокнаў, стала, столі, паліц і інш. Для яе ўзорах характэрна рытмічнасць, шмат сюжэтнасць (святочныя і побытавыя сюжэты), сімвалічнаць (дрэвы, расліны, з‘явы).

У творы Ігара Воўчака «Несцерка» 2013 адлюстраваны герой, які пераадольвае розныя перашкоды, паказвае важнасць працавітасці, гумару ў жыцці, паказвае на справах прымаўкі, напрыклад: «Захочаш есці, навучышся і колы гнуць, і лапці плесці», «Не пазнаўшы ліха, не пазнаеш і радасці», «Трэба глядзець пад ногі. Часта скарб ляжыць пад нагамі».

«Аповесць мінулых гадоў» – серыя гісторыка-пазнавальных мультфільмаў пра ўзнікненні гербаў беларускіх гарадоў На дадзены момант зняты 36 гісторый. Аўтарам ідэі з‘яўляецца Ігар Волчак, праект са-творчы і здзясняецца шэрагам рэжысёраў А.Ленкіным, М.Тумеляй, Р.Сінкевічам, У.Пяткевічам, Н. Хаткевіч, І.Кадзюковай і інш. Адначасова з гісторыяй узнікнння герба пэўнага горада ў творы распавядаецца аб адметнасцях і традыцыях. Так у сюжэце прысвечаным г.Чэрвень (рэж. А.Ленкін) распавядаецца аб традыцыях бортнцтва. Персанажы ў творы прадстаюць у традыцыйнай вопрацы, займаюцца справамі звязанымі з пчалярствам, распавядаецца аб бортным праве, аб вытворчасці з воска і мёду, аб нябесным заступніку пчаляроў (Іаан Златавуст). Эпізод выкананы ў цёплай колеравай гамме, мае даволі хуткую і рытмічную гукавую афарбоўку. Пася прагляду застаюцца пазітыўныя эмоцыі, што натхняе на далейшае азнаямленне з гісторыяй і традыцыямі Беларусі.

Нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм», не адзіны вытворца анімацыйных фільмаў у краіне. Варта адзначыць, выпускныя творы студэнтаў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, незалежных аўтараў, студый, праектныя прадукты.

Напрыклад, анімацыйны фільм ―Будзьма Беларусамі” Юліі Ляшкевіч і Юліі Рудзіцкай. У фільме распавядаецца гісторыя Беларусі ад пачатку свету, да нашых часоў. У стужцы можна пабачыць міфічныя прадстаўленні нашых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

продкаў (пераўтварэнне ў ваўкоў), культурную спадчыну (Крыж Ефрасініі Полацкай, архітэктурную спадчыну), выбітных дзеячаў (князёў, асветнікаў).

Акрамя асабістай цікавасці аўтараў да традыцый, стымулюе стварэнне тэматычна фальклорных і гістарычных твораў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. На сайце Міністэрства ужо размешчаны тэмы адкрытага конкурсу на вытворчасць фільмаў у рамках сацыяльна-творчага заказу 2018 г.У катэгорыі «Фільм у анімацыйнай форме» вызначаны наступныя тэмы: «Навучальныя гісторыі для дзяцей»; «Жыццё выдатных людзей»; «Казкі беларускіх пісьменнікаў»; «Фільм для сямейнага прагляду»; «Прыгодніцкі фільм для дзяцей»; «Казкі народаў свету»; «Музычная казка»; «Сучасная казка»; «Беларуская міфалогія»; [2] .

Нажаль, на дадзены момант пытанні магчымасці прагляду беларускіх анімацыйных твораў застаюцца адкрытамі. Спадзяемся, гэтыя пытанні будуць вырашаны з дапамогай як сучасных тэхналогій, так і правядзення мерапрыемстваў прысвечаных анімацыйнаму мастацтву.

Анімацыйныя творы з‘уляюцца ўнікальнай формай захавання і распаўсюда нацыянальных традыцый. Дзякуючы праглядам анімацыйных твораў гледачы могуць пераняць традыцыі, пашырыць свой кругагляд, зацікавіцца культурай і гісторыяй краіны. Дзякуючы нацыянальным традыцыям кожны народ ацэньвае рэчаіснасць самастойна і адчувае сабе непаўторнай, самабытнай нацыяй. Нацыянальныя традыцыі, якія ахопліваюць усе бакі жыцця чалавека забяспечваюць пераемнасць культуры пакаленнямі.

1. Дубянецкі Э.С. Культуралогія: Энцыкл.давед. / Э.С. Дубянецкі; Маст. А.А. Глекаў. – МН.: БелЭн, 2003. – 384 с.: іл.

2. Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь [Электронны рэсурс]. – Рэжым дасягу: http://kultura.gov.by. Дата дасягу: 15.03.2018]

3. Нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм» [Электронны рэсурс]. – Рэжым дасягу: http://www.belarusfilm.by/. Дата дасягу: 15.03.2018

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ